**УЛАДЗІМІР МЯЖЭВІЧ**

●

# РАЗАМ З ЛЮДЗЬМІ

Каля гіда, ці, як тады называлі, «тлумача», у павільёне керамікі сабралася чалавек дваццаць экскурсантаў. Той-сёй з іх быў у лапцях і ў шэрай суконнай світцы. На некаторых былі гарадскія пінжакі, куплёныя картовыя штаны і такія ж шапкі, але па фасоне аддзення і па тым, як людзі паводзілі сябе, можна было здагадацца, што яны таксама вясковыя. Экскурсанты, відаць, здалёк прыехалі ў сталіцу на беларускую сельскагаспадарчую і прамысловую выстаўку. Выстаўка размяшчалася там, дзе цяпер, за плошчай імя Калініна, Слясарны завулак. А тады гэта было за горадам. Незадоўга перад тым у межы Мінска ўключылі Камароўку. Дзе-нідзе яшчэ між павільёнаў выстаўкі стаялі сосны і тырчалі нявыкарчаваныя пні.

Тлумач расказваў, як робяць чарапіцу і якая гэта ў гаспадарцы карысная рэч. Яна і агнетрывалая, і танная, і ўстойлівая.

Гід, відаць, быў студэнт—учарашні вясковы хлопец. Але ў горадзе ён паспеў ужо нахапацца розных замежных слоў і цяпер сыпаў іх цэлымі прыгаршчамі. Дзядзькі слухалі яго, так, мусіць, і не ўцяміўшы, што азначаюць гэтыя «прагрэс», «канцэнтрацыя», «спецыялізацыя».

Да экскурсантаў, што тоўпіліся ля тлумача, падышоў невысокі чалавек. На ім былі ношаны, але чысты гарнітур, руская касаваротка і просценькая шапка з высокім аколышкам і мяккім казырком. Чалавек слухаў гіда і ўсміхаўся сабе ў вусы.

— А ці не лепш, малады чалавек, з людзьмі весці гаворку прасцей, без гучных і прыгожых слоў?—раптоўна запытаў ён у тлумача...

Экскурсанты павярнуліся на голас, і нехта сказаў: «Гэта ж таварыш Чарвякоў!»

Сяляне павесялелі і адразу абступілі ўсебеларускага старасту.

— Вось дзякуй вам, таварыш Чарвякоў, што заступіліся за нас,—загаварыў мой сусед з рыжаю барадой і ў вышыванай кашулі.—У мяне ўжо галава закружылася ад гэтых незразумелых слоў. Вельмі многа вучоных вы тут паставілі, таварыш старшыня!

— Гэта не ад вучонасці,—сказаў, смеючыся, Аляксандр Рыгоравіч,—а ад фанабэрыі. Сярод маладых людзей іншы раз сустракаюцца і такія, што забываюць, як завуцца граблі. Калі такі дзяцюк наступіць на іх нагой ды грабільна яго трэсне па лобе, вось тады, расціраючы гуз, ён і прыгадае, што гэта за штука.

Экскурсанты дружна засмяяліся. Адзін з іх сказаў:

— Гэта вы, таварыш Чарвякоў, пэўна, чулі недзе пра нашага Пацэйкавага Петруся? З ім якраз так і было, як вы расказваеце.

— Не, гэта я ў Якуба Коласа прачытаў. Можа ён і напісаў пра вашага Петруся, хто яго ведае. Нешта занадта развялося ў нас такіх Петрусёў. Не паспее каторы ў горадзе прыжыцца, як яго, што муху на мёд, цягне на мудрагелістыя словы. Давялося мне сустракаць аднаго маладога агранома, дык ён кроку не зробіць, каб не сказаць якое замежнае слова. Аднойчы запрасілі гэтага агранома калгаснікі да сябе, каб расказаў, як дамагчыся лепшага ўраджаю на іхняй нішчымнай зямлі. І што ж ён гаварыў?

Чарвякоў дастаў з кішэні кніжачку, разгарнуў яе.

— Я зараз прачытаю. Слухайце. «Меліярацыя кааператыўных асацыяцый рэагуе прагрэсіўны прагноз вытворчасці, а канцэнтрацыя корму павышае інтэнсіўнасць жывёлагадоўлі». Адзін чалавек запісаў гэтую тарабаршчыну і прыслаў мне. Трапіўся выпадак і мне сустрэцца з гэтым аграномам. Я прачытаў яму гэтыя словы і запытаў, што ён хацеў сказаць калгаснікам? Ён са здзіўленнем падняў на мяне вочы. Няўжо, маўляў, незразумела? Дрэнна, што такія Петрусі не бачаць сваіх памылак. Калі чалавек зробіць памылку і разумее гэта, то яму лёгка яе і выправіць.

— Праўду вы кажаце, Ляксандра Рыгоравіч,—праціснуўся да Чарвякова селянін у гарадской паддзёўцы; было яшчэ цёпла, чалавек спацеў і раз-пораз выціраў далонёй твар.—Хачу прасіць вас, каб вы перадалі наш паклон і падзяку песнярам Янку Купалу і Якубу Коласу. Добрыя вершы яны складаюць. Але нешта даўнавата не трапляліся мне вершы Коласа. Ці піша ён зараз, Ляксандра Рыгоравіч?

— Вядома, таварыш, піша. Вось учора чытаў яго новы верш, і ў памяці засталіся такія радкі:

Жыццё не йдзе, а шкваліць бурай,
І што ні момант, што ні час,
Расце парыў і творчасць мас,
І за падмуркамі падмурак
Узводзіць модная натура
Нядаўні раб і свінапас.

Чарвякоў ласкава паглядзеў на сваіх слухачоў, а тады сказаў:

— Во з якой душой пра наш час гаворыць Якуб Колас!

— Вялікае вам дзякуй, Ляксандра Рыгоравіч, за добры верш,—зноў загаварыў чалавек у паддзёўцы.—Праўду піша Якуб Колас. Разбудоўваецца, мяняецца ўсё. Паглядзелі б, як разроссся наш калгас «Чырвоны сцяг»! Вы ж, Ляксандра Рыгоравіч, таксама памагалі яго арганізоўваць.

— Гэта ў Гарадку?

— Не, Ляксандра Рыгоравіч, мы з-пад Быхава, залескія.

— Як жа, памятаю! Разроссся, значыць, «Чырвоны сцяг»? Гэта добра. А пачынаць было цяжка. Перадайце, таварыш, сваім аднавяскоўцам, што да вас я абавязкова завітаю.

— Дзякуем, перадам,—чалавек паглядзеў на сваіх суседзяў, а потым загаварыў зноў:—Скажыце, Ляксандра Рыгоравіч, вы сёння вельмі заняты?

— А што вы хацелі?

— Хочам вас папрасіць прайсці з намі па выстаўцы...

Чарвякоў усміхнуўся:

— А ці не выйдзе так, што я ў вашых тлумачоў буду хлеб адбіваць? Яшчэ пакрыўдзяцца і напішуць на мяне скаргу.

— Дык мы ж самі просім,—пачулася некалькі галасоў.

— Добра,—сказаў нарэшце Аляксандр Рыгоравіч.—Хіба на якое паўгадзіны. Больш не змагу: чакаюць тэрміновыя справы.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Экскурсанты ўзрадаваліся, загаманілі. Да іх пачалі далучацца людзі і з іншых груп.

— Давайце, таварышы, пачнем з павільёна электрыфікацыі.

Праз некалькі хвілін Чарвякоў стаяў ужо каля карты рэспублікі, дзе яркай лямпачкай ззяла БелДРЭС, пабудаваная ў першай пяцігодцы на Асінаўскіх балотах.

— 24 тысячы кілават электраэнергіі дае нам першая чарга гэтай станцыі,— гаварыў Аляксандр Рыгоравіч.— Але ж гэта толькі першая ластаўка. Вось тут мы пабудуем Прапойскую, а тут Гомельскую, Бабруйскую, Мінскую электрастанцыі. Недалёка той час, калі лямпачка Ільіча засвеціць у кожнай сялянскай хаце, калі электрычная энергія—самая танная, між іншым,—заменіць цяжкую працу чалавека. Чалавек толькі будзе кіраваць машынамі.

— А ці дужа гэта многа—24 тысячы?—спытаўся нехта.

— Магутнасць электрастанцый Мінска, дзе працуе трынаццаць буйных прадпрыемстваў, больш за сорак сярэдніх і каля сотні дробных, дасягае трох тысяч кілават. БелДРЭС, значыць, у восем разоў мацней. Таму не дзіва, што яна дае ток многім гарадам рэспублікі.

Экскурсаводы з другіх павільёнаў прыйшлі, каб паслухаць. Не кожны ж дзень здараецца такое, што сам старшыня ЦВК БССР Чарвякоў выступае тлумачом на выстаўцы!

— Нажыў сабе кучу непрыемнасцей,—жартаваў Аляксандр Рыгоравіч.— Апроч таго, што спрабаваў адбіць хлеб у экскурсаводаў, дык яшчэ і на пасяджэнне спазніўся.

Развітваючыся з сялянамі, Чарвякоў падышоў да калгасніка з Залесся.

— А вас ледзь пазнаў,—сказаў ён весела.—Змяніліся вы. Выглядаеце лепш. Гэта ж я быў вашым госцем! Хачу вам аддзякаваць. Не адгаворвайцеся, а начавацъ прыходзьце да мяне. Скажу жонцы, каб чакала. Можа стацца, што я позна вярнуся з працы, дык вы, калі ласка, не кладзіцеся рана спаць. Нам будзе пра што пагаварыць.

## Спатканні на дарогах

Зноў, каторы раз, мы абмінаем вазы са збожжам. Ідуць чырвоныя абозы. Пярэдні вазак трымае ў руках чырвоны сцяг. Невялічкае палотнішча рве вецер, але чалавек, прывязаўшы лейцы да пояса, моцна трымае сцяг. Ён бачыць нашы цікаўныя позіркі і яшчэ вышэй узнімае сцяг.

— Хлеб, ідзе хлеб,—задумліва гаворыць Аляксандр Рыгоравіч, узіраючыся на фурманкі.—Дорага ён нам дастаецца. А ўсё з-за гэтых перагібшчыкаў. Робяць яны па-свойму, а адказнасць звальваюць на Савецкую ўладу. Іншы раз думаеш: мусіць, моцна любяць сяляне сваю ўладу, калі даруюць ёй гэтакую крыўду. Адказ варта шукаць у прыродзе нашай дзяржавы. Свая ж улада. Селянін ведае: матчын гнеў, што веснавы снег—многа выпадае, але хутка растае... У Бабруйску трэба заехаць у «Загатзбожжа», паглядзець, як там прымаюць жыта. І ці добра яно захоўваецца.

Зноў абмінаем фурманкі і пешых, што сыходзяць на абочыну і глядзяць на машыну. Толькі старэнькі дзядок, што ідзе канаваю, не ўзнімае галавы. Ён у лапцях, у саматканай, зрудзелай ад часу світцы, з кошыкам за плячыма.

— Прыпыніце машыну!—просіць шафёра Чарвякоў. Ён сам адчыняе дзверцы і гукае:—Бацька, ідзіце сюды, падвязём.

Стары нясмела падыходзіць, здымае кошык.

— У Бабруйск?—пытае Аляксандр Рыгоравіч.

— Унучка там у мяне жыве, дык ёй вось слівак і яблычкаў салодзенькіх нясу,—адказвае дзядок.—Бацьку забілі белапалякі. Сірата. Хто ж яе пашка-

дуе, нябогу. Да мяне прыехаць не можа—на казённай службе. А душу пасаладзіць кожнаму ж хочацца.

— А на якой службе ваша ўнучка, бацька?

— Можа чулі на Бярозе-рацэ новы завод адкрылі? Там мая ўнучка хванеру робіць.

— А далёка жывяце ад Бабруйска?—зноў пытае Чарвякоў.

— Не так, каб вельмі, але вёрстаў дваццаць набярэцца.

Хоць стары аднекваўся, але Аляксандр Рыгоравіч пасадзіў яго на сваё месца, побач з шафёрам, а сам пераходзіць да нас.

Ён распытвае дзеда, у якой вёсцы той жыве, колькі яму год, як яго прозвішча, ці працуе яшчэ ў калгасе. Дастае з кішэні запісную кніжку і нешта занатоўвае...

На шырокім двары «Загатзбожжа» стаялі вазы з мяшкамі. Аляксандр Рыгоравіч абышоў склады, па-гаспадарску агледзеў і праверыў, ці спраўныя вагі, пацікавіўся, пры якой вільготнасці захоўваецца збожжа. Пахваліў кіраўнікоў, што ў іх усё добра арганізавана і прадугледжана. Параіў зрабіць для здатчыкаў пакой адпачынку.

— Трэба, каб калгасніку і аднаасобніку прачыталі газету, пачаставалі чаем.

Калі Чарвякоў ішоў да машыны, яго абкружылі сяляне-здатчыкі. Папрасілі расказаць пра навіны ў краіне, што будзе будавацца ў другой пяцігодцы, якія машыны атрымаюць калгасы.

— У народзе гавораць: найсмачнейшы хлеб ад свае працы,—пачаў Аляксандр Рыгоравіч.—Гэта святая праўда. Мы самі будуем сваё жыццё, самі цагліну за цаглінай кладзем у той будынак, дзе ўсіх людзей працы чакае сапраўднае шчасце. Яшчэ нядаўна адзін наш беларускі паэт пытаў, калі яго край стане «краем фабрык дымных і машын». Цяпер гэта ўжо рэчаіснасць. Зусім нядаўна ў вас, у Бабруйску, уступіў у строй і выдае прадукцыю адзін з буйнейшых у Еўропе дрэваапрацоўчы завод.

Ён пералічваў новабудоўлі: Крычаўскі цэменты, Гомсельмаш, БелДРЭС, фабрыка «Бярэзіна» і іншыя.

— Гэта толькі пачатак, таварышы. Беларусь будзе мець свае машынабудаўнічыя заводы.

Сяляне пыталіся пра падаткі і пра статут сельскагаспадарчай арцелі, пра абутак і мануфактуру. І пакуль Аляксандр Рыгоравіч не адказаў на ўсе пытанні, датуль не злез з воза.

З Бабруйска мы паехалі на Рагачоў. Кіламетраў за пятнаццаць ад горада, пасярод дарогі стаяў чалавек, падняўшы ўгору руку.

— Падвязіце да Рагачова,—папрасіўся ён.

Чалавек меў год пад трыццаць пяць, не болей. Апрануты па-гарадскому, але цераз плячо перакінута зрэбная кайстра.

— Адкуль і куды ідзяце?—запытаў Чарвякоў, калі чалавек сеў.

— А хіба вам не ўсё роўна?—з фанабэрыяй адказаў незнаёмы.—Іду шукаць шчасця!

— І якое шчасце хочаце знайсці?

— Звычайнае, каб мяшок грошай і вагон масла, каб ніякае працы.

Аляксандр Рыгоравіч павярнуўся і пільна паглядзеў на пасажыра.

— Памыляецеся, шаноўны: шчасце не ў грошах, а ў тым, каб прыносіць карысць людзям. Любіць свой край, свой родны народ, жыць з ім і працаваць, дамагацца лепшай долі для ўсіх—вось сапраўднае шчасце для чалавека. Нездарма ж у народзе гавораць, што чалавеку дарагая тая хатка, дзе нарадзіла яго матка.

— А мне напляваць на хатку і на матку!—са злосцю сказаў дзяцюк.

Такога Аляксандр Рыгоравіч не чакаў. Ён кінуў на пасажыра гнеўны погляд.

— З калгаса ўцёк?—рэзка запытаў ён.

— Няма дурняў працаваць на калгасы...

— Значыць, ты з «разумных»?..

У гэты час машына мінула мост цераз Друць. Мы ўязджалі ў Рагачоў.

— У міліцыю!—загадаў Чарвякоў.—Трэба высветліць, што гэта за чалавек, у якога няма нічога святога. Ён плюе на родную матку, што дала яму жыццё, на родны край, што выгадаваў яго.

Дзяцюк пачаў прасіцца, нават хацеў адкрыць дзверцы і выскачыць на хаду. Але Аляксандр Рыгоравіч быў няўмольны, яго нібы падмянілі. Я ніколі не бачыў яго такім суровым, нават злосным. Вочы зрабіліся жорсткія.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## У Маскве

Тагачасны прэзідэнт Акадэміі навук БССР Павел Восіпавіч Горын аднекваўся, як мог, а славуты майстра па шахматах вельмі хацеў згуляць з ім партыю.

— Нарэшце, я згодны даць вам фору,—сказаў майстра.

— Якую фігуру?—пацікавіўся Павел Восіпавіч.

— Ну, напрыклад, слана.

— Давайце ладдзю!

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы